ЗАЦВЕРДЖАНА

Пастанова
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
06.08.2020 № 213

**Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце**
**«Элементы эканамічных ведаў»**
для XI–XII класаў першага аддзялення дапаможнай школы
(дапаможнай школы-інтэрната)
для дзяцей з інтэлектуальнай недастатковасцю з беларускай мовай навучання і выхавання

## ГЛАВА 1
## АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Дадзеная вучэбная праграма па вучэбным прадмеце «Элементы эканамічных ведаў» (далей – вучэбная праграма) прызначана для XI–XII класаў паглыбленай сацыяльнай і прафесійнай падрыхтоўкі першага аддзялення дапаможнай школы (дапаможнай школы-інтэрната) для дзяцей з інтэлектуальнай недастатковасцю.

2. Дадзеная вучэбная праграма разлічана на 35 гадзін для кожнага класа.

Сацыяльная адаптацыя, якая з'яўляецца мэтай навучання і выхавання асоб з інтэлектуальнай недастатковасцю, мяркуе сфарміраванасць жыццёвых і сацыяльна асобасных кампетэнцый. Асновай фарміравання такіх кампетэнцый, у тым ліку, з'яўляецца фарміраванне элементарных эканамічных ведаў.

Элементарная эканамічная пісьменнасць неабходна кожнаму выпускніку дапаможнай школы для арыенціроўкі ў сучасных эканамічных умовах. «Элементы эканамічных ведаў» – гэта вучэбны прадмет агульнаразвіццёвага і сацыяльнага характару, які дазваляе канкрэтна, практычна атрымаць элементарныя ўяўленні аб эканамічных адносінах чалавека з навакольным светам, умовах яго жыцця і дзейнасці, сфарміраваць уменні, неабходныя для сацыялізацыі ў эканамічнай сферы.

Змест дадзенай вучэбнай праграмы накіраваны на фарміраванне неабходных якасцей асобы – эканомнасць, арганізаванасць, самастойнасць выбару рашэння, уменне планаваць, забеспячэнне магчымасці вырашэння побытавых і прафесійных задач, дапамагае арыентавацца ў паўсядзённым жыцці і сучаснай вытворчасці.

Дадзеная вучэбная программа распрацавана з улікам тэндэнцый развіцця эканамічнай адукацыі і выхавання навучэнцаў ва ўстановах агульнай сярэдняй і спецыяльнай адукацыі, з аднаго боку, і інклюзіўнага падыходу ў адукацыі – з другога.

3. Мэта – фарміраванне жыццёва вызначальных эканамічных кампетэнцый у вучняў, здольнасці і гатоўнасці арыентавацца ў канкрэтных сацыяльна-эканамічных з'явах і сітуацыях.

4. Задачы:

фарміраванне элементарных тэарэтычных і прыкладных эканамічных ведаў;

фарміраванне элементарных навыкаў эканамічных паводзінаў: умення прымяняць эканамічныя веды і прымаць самастойныя рашэнні ў канкрэтных умовах, умення рабіць элементарныя эканамічныя разлікі, умення рацыянальна выкарыстоўваць даступныя матэрыяльныя сродкі; умення суадносіць уласныя патрэбы са сваімі матэрыяльнымі магчымасцямі;

фарміраванне эканамічна значных асобасных якасцей: працавітасці, беражлівасці, ашчаднасці, гаспадарлівасці і каштоўнасных арыенціраў, неабходных для рацыянальных паводзінаў у сферы эканамічных адносін у грамадстве.

5. Дадзеная вучэбная праграма вызначае комплекс ведаў, уменняў эканамічнага характару, мінімальна неабходных асобам з інтэлектуальнай недастатковасцю, якія ўступаюць у самастойнае жыццё, і арыентавана на фарміраванне ў вучняў прыкладных ведаў, уменняў, жыццёвых і сацыяльна асобасных кампетэнцый.

Змест дадзенай вучэбнай праграмы для XI і XII класаў рэалізуецца цыклічна і мае адрозненне па класах, што дазваляе вывучаць ключавыя тэмы на розным узроўні складанасці, забяспечваць бесперапыннасць паўтарэння матэрыялу, яго вар'іраванне з улікам складу вучняў, іх індывідуальных магчымасцей. Паслядоўнасць вывучаемага вучэбнага матэрыялу па раздзелах «Патрэбы. Рэсурсы. Выбар», «Вытворчасць. Эканоміка» і гэтак далей адпавядае агульнапрынятай логіцы вывучэння матэрыялу эканамічнага зместу.

Змястоўную аснову дадзенай вучэбнай праграмы складае дзейнасць чалавека ў эканамічнай сістэме, якая ажыццяўляецца ў наступных асноўных сферах: вытворчасць, размеркаванне, спажыванне; хатняя гаспадарка, прадпрыемства, рынак; у працэсе выканання розных роляў (вытворца, спажывец, грамадзянін); на розных узроўнях (індывідуальным, рэгіянальным, рэспубліканскім).

Асаблівасцю дадзенай вучэбнай праграмы з'яўляецца разгорнуты характар яе зместу. Такі падыход дасць магчымасць больш эфектыўна вызначаць метадычныя аспекты рэалізацыі зместу, улічваць, што навучэнцы валодаюць вельмі абмежаванымі магчымасцямі пазнання нават элементарных эканамічных з'яў, інтэрпрэтацыі атрыманай інфармацыі, прымянення ведаў у новай сітуацыі.

6. Аснову ўрокаў складаюць актыўныя формы навучання, якія прадугледжваюць прайграванне канкрэтных практычных сітуацый эканамічнага характару, блізкіх, зразумелых вучням; якія вызначаюць паўсядзённае жыццё (побытавыя, праца прадпрыемства, гандлю і гэтак далей); якія адлюстроўваюць рэальныя эканамічныя адносіны ў школе, сям'і, пасёлку, горадзе, вобласці, рэспубліцы.

Вывучэнне праграмных тэм прадугледжвае не толькі працу з матэрыяламі навучальнага дапаможніка, але і арганізацыю дзелавых, імітацыйных, ролевых гульняў, аналіз сітуацый эканамічнага характару, рашэнне элементарных эканамічных задач. Замацаванню атрыманых ведаў будуць спрыяць экскурсіі на прамысловыя, сельскагаспадарчыя прадпрыемствы, аб'екты гандлю.

Рэалізацыя метадычнага аспекту вывучэння вучэбнага прадмета патрабуе ад педагога ўмелага спалучэння выкарыстання тэкстаў і метадычнага апарату навучальнага дапаможніка з падборам эканамічнай інфармацыі з даведачнай і папулярнай літаратуры, сістэматызацыі і адаптацыі яе да інтэлектуальных магчымасцяў вучняў, уяўляючы ў выглядзе табліц, схем, дыяграм, малюнкаў.

Выкарыстанне нагляднага матэрыялу з'яўляецца абавязковай метадычнай умовай, якая забяспечвае паўнату разумення складаных эканамічных з'яў і працэсаў. Надзвычай важным з'яўляецца рэалізацыя кампетэнтнаснага падыходу ў падборы і складанні практычных заданняў і практыкаванняў. Усе прапанаваныя да разгляду і абмеркавання з вучамі сітуацыі павінны адлюстроўваць рэальныя эканамічныя адносіны.

Педагагічнаму работніку даецца права ўносіць змены і дапаўненні ў праграму, выключаць ускладнены матэрыял, размяркоўваць яго па чвэрцях, не парушаючы паслядоўнасці вывучэння раздзелаў.

Дадзеная вучэбная праграма прадугледжвае цесную ўзаемасувязь з іншымі вучэбнымі дысцыплінамі. Уключэнне ва ўрокі сітуацый, заснаваных на міжпрадметных сувязях з такімі вучэбнымі прадметамі, як матэматыка, сацыяльнае арыентаванне, элементы камп'ютарнай пісьменнасці, прафесійная падрыхтоўка і іншымі. Гэта будзе спрыяць памяншэнню цяжкасцяў у разуменні вучнямі эканамічных з'яў, набыццю ўменняў у іх практычным жыцці.

## ГЛАВА 2
## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ

XI КЛАС (35 г.)

Уводзіны (1 г.)

Што такое эканоміка? Навошта чалавеку веды па эканоміцы? Сувязь эканомікі і вядзення гаспадаркі (чалавека, сям'і, дзяржавы). Значэнне ведаў па эканоміцы для развіцця чалавека і паляпшэння ўмоў яго жыцця.

Асноўныя паняцці: эканоміка, гаспадарка, гаспадарчая дзейнасць.

Раздзел 1. Патрэбы. Рэсурсы. Выбар (7 г.)

Тэма 1.1 Патрэбы (4 г.)

Біялагічныя і матэрыяльныя патрэбы чалавека як умовы падтрымання жыцця людзей.

Здароўе – галоўнае багацце чалавека. Патрэба ў захаванні здароўя, абароне жыцця і бяспецы.

Чалавек як частка прыроды. Адрозненне патрэб чалавека ад патрэбаў жывёл і раслін. Сацыяльныя і духоўныя патрэбы. Патрэба ў зносінах як умова жыцця людзей. Адукацыя як неабходная ўмова задавальнення патрэбаў і жыцця ў грамадстве.

Розныя патрэбы чалавека. Залежнасць патрэбаў ад сітуацыі, узросту, полу, густаў, месца жыхарства чалавека. Разумныя і неразумныя патрэбы.

Тэма 1.2 Даброты і патрэбы (1 г.)

Крыніцы задавальнення патрэбаў чалавека: усё, што зроблена прыродай, пераўтворана чалавекам, карыстанне паслугамі. Даброты прыродныя і эканамічныя (створаныя працай чалавека). Чалавек – спажывец даброт.

Спосабы задавальнення патрэбаў.

Тэма 1.3 Рэсурсы (1 г.)

Рэсурсы як крыніцы для задавальнення патрэбаў людзей. Віды рэсурсаў: прыродныя, працоўныя, вытворчыя (гаспадарчыя), фінансавыя. Неабмежаваныя і абмежаваныя прыродныя рэсурсы. Эканамічныя рэсурсы і іх абмежаванасць.

Тэма 1.4 Абмежаванасць магчымасцяў і рэсурсаў.

Выбар (1 г.)

Немагчымасць задавальнення ўсіх патрэбаў чалавека. Праблема адноснай абмежаванасці рэсурсаў і магчымасцяў – праблема ўсіх людзей. Абмежаванасць рэсурсаў і выбар чарговасці задавальнення патрэбаў.

Асноўныя паняцці: патрэбы (біялагічныя, матэрыяльныя, сацыяльныя і духоўныя), рэсурсы (прыродныя, працоўныя, вытворчыя (гаспадарчыя), фінансавыя); абмежаваныя і неабмежаваныя рэсурсы, прыродныя і эканамічныя даброты, спажывец, выбар.

Раздзел 2. Эканоміка і вытворчасць (4 г.)

Тэма 2.1 Развіццё эканамічных адносін (2 г.)

Перадумовы з’яўлення эканамічных адносін паміж людзьмі. Натуральная гаспадарка. Ад натуральнай гаспадаркі да таварнай вытворчасці. Паздзел працы. Тавар – прадукт працы чалавека. Паслуга – дзеянні, накіраваныя на задавальненне якіх-небудзь патрэбаў. Таварная вытворчасць.

Эканамічная дзейнасць чалавека як спосаб умела гаспадарыць, выкарыстоўваць абмежаваныя рэсурсы для задавальнення сваіх патрэбаў.

Тэма 2.2 Вытворчасць – аснова эканомікі (2 г.)

Што такое вытворчасць? Неабходнасць рэсурсаў для арганізацыі вытворчасці. Тавары і паслугі як вынік вытворчасці. Арыентацыя вытворчасці на задавальненне патрэбаў людзей. Падзел працы і прадукцыйнасць. Падзел працы паміж сферамі сельскай гаспадаркі, прамысловасці, краінамі.

Вытворчасць – аснова жыццезабеспячэння чалавека і дабрабыту грамадства. Стварэнне ўмоў для павышэння ўзроўню жыцця людзей. Сацыяльна арыентаваная палітыка дзяржавы.

Асноўныя паняцці: эканамічная дзейнасць, натуральны абмен, натуральная гаспадарка, падзел працы, таварная вытворчасць, тавар, паслуга, вытворчасць, прадукцыя, прадпрыемства, прыбытак (выгада, даход), прадукцыйнасць працы, узровень жыцця, сацыяльна арыентаваная палітыка дзяржавы.

Раздзел 3. Праца і прафесія (4 г.)

Тэма 3.1 Праца як умова існавання людзей (2 г.)

Праца – асноўная крыніца задавальнення патрэбаў чалавека. Вынік працы чалавека – стварэнне карысных тавараў і паслуг. Віды працы і працоўнай дзейнасці: простая і складаная праца. Кваліфікаваная праца. Праца ў сям'і і на вытворчасці. Вучоба – асноўная праца школьніка.

Забеспячэнне насельніцтва неабходнымі таварамі і паслугамі. Галоўныя вытворчыя аб'екты горада, вобласці, рэспублікі. Вынік іх вытворчасці. Эканамічныя даброты, ствараемыя бацькамі, блізкімі.

Тэма 3.2 Прафесія (2 г.)

Як узніклі і развіваліся прафесіі: ад старажытных рамеснікаў да сучасных прафесій. Узаемасувязь і ўзаемазалежнасць людзей розных прафесій пры стварэнні тавараў і паслуг. Прафесійныя, асобасныя і эканамічныя якасці чалавека, які працуе.

Прафесійная адукацыя. Роля прафесійнай адукацыі ў падрыхтоўцы кадраў. Дзе атрымліваюць прафесійную адукацыю. Працоўныя рэсурсы твайго рэгіёну (горада, пасёлка, вёскі і гэтак далей).

Асноўныя паняцці: працоўная дзейнасць, праца простая і складаная, фізічная і разумовая, кваліфікаваная праца, кваліфікацыя, працоўныя рэсурсы, вытворчыя аб'екты, эканамічныя даброты; прафесіі, працавітасць, прафесійная адукацыя, спецыяльнасць.

Раздзел 4. Грошы (6 г.)

Тэма 4.1 Як працуюць грошы (2 г.)

Бартар – найпрасцейшая форма абмену. Як з'явіліся грошы. Іх прызначэнне і функцыі. Мера кошту і каштоўнасці тавару, паслуг. Зварот грошай. Грошы як плацежны сродак куплі-продажу (абмену) тавараў і аплаты паслуг. Грошы як сродак існавання чалавека, зберажэнні і назапашванні.

Віды грошай: грошы папяровыя і металічныя, наяўныя і безнаяўныя (пластыкавая картка для атрымання грошай у банкамаце). Уласцівасці грошай: непаддзельнасць, зручнасць карыстання, зносастойкасць, пазнавальнасць, дзялімасць.

Тэма 4.2 Грашовая адзінка Беларусі (1 ч.)

Гісторыя грашовай адзінкі Рэспублікі Беларусь.

Нацыянальная і замежная валюта. Курс валют.

Тэма 4.3 Банк. Грашовыя разлікі (3 ч.)

Установы, дзе знаходзяцца грошы і ажыццяўляюцца аперацыі з імі (банкі). Для чаго патрэбныя банкі? Віды банкаў (цэнтральны банк, камерцыйныя банкі). Арганізацыя работы банка. Банкаўскі рахунак. Уклад (дэпазіт). Крэдыт. Укладальнік і пазычальнік.

Паслугі банка. Безнаяўныя разлікі – зручна, бяспечна і эканамічна. Банкаўская плацежная картка. Крэдытныя карты. Карты растэрміноўкі. Банкамат. Інфакіёск.

Рацыянальнае выкарыстанне грашовых сродкаў, эканомія грошай.

Асноўныя паняцці: бартар, таварныя грошы, манеты, наяўныя грошы і безнаяўныя грошы, зварот грошай, валюта, нацыянальная валюта, замежная валюта, валютны курс, банк, Нацыянальны банк Рэспублікі Беларусь, уклад (дэпазіт), крэдыт, укладальнік, пазычальнік, бягучы банкаўскі рахунак, банкаўская плацежная картка, банкамат, інфакіёск, безнаяўны разлік.

Раздзел 5. Тавар. Паслугі. Гандаль. Цана (4 г.)

Тэма 5.1 Тавары і паслугі (2 г.)

Тавар – прадукт працы, зроблены на продаж. Тавары харчовыя і нехарчовыя.

Тавары працяглага і кароткатэрміновага карыстання. Тавары індывідуальнага і змешанага карыстання. Спажывецкія тавары. Характарыстыка тавару: карыснасць тавару, кошт, якасць.

Паслугі як від дзейнасці. Узаемазалежнасць прадастаўлення паслуг і патрэб людзей.

Чалавек – вытворца тавараў і паслуг, іх спажывец.

Тэма 5.2 Гандаль. Цана (2 г.)

Гандаль. Узаемасувязь гандлю і вытворчасці. Віды гандлю: унутраны і знешні, аптовы і рознічны, дзяржаўны і прыватны гандаль.

Месца куплі-продажу (крамы, рынкі, кірмашы і іншыя). Пакупнік. Прадавец.

Цана – грашовае выражэнне кошту тавару. Ад чаго залежыць устанаўленне велічыні цаны тавару. Віды цэн: дзяржаўныя, рынкавыя, дагаворныя, сезонныя, аптовыя, рознічныя. Прычыны змены цэнаў, адрозненне цэнаў на адны і тыя ж тавары. Акцыі і зніжкі.

Асноўныя паняцці: тавар, паслуга; тавары харчовыя і нехарчовыя, кароткатэрміновага і доўгага, індывідуальнага і змешанага карыстання; спажывецкія тавары, карыснасць і кошт тавараў; гандаль, унутраны і знешні гандаль, аптовы і рознічны гандаль, дзяржаўны і прыватны гандаль; цана, дзяржаўныя, рынкавыя, дагаворныя, сезонныя, аптовыя, рознічныя цэны, пакупнік, прадавец, рэклама.

Раздзел 6. Эканоміка хатняй гаспадаркі (6 г.)

Тэма 6.1 Сям’я і хатняя гаспадарка (1 г.)

Члены сям’і – раўнапраўныя ўдзельнікі хатняй гаспадаркі. Гаспадарчая дзейнасць у сям’і. Хатняя праца. Віды хатняй працы. Падзел працы паміж бацькамі, сваякамі і дзецьмі. Сумесная праца дзяцей і дарослых. Узаемадапамога ў сям’і.

Тэма 6.2 Сямейны бюджэт (3 г.)

Даходы сям’і. Заработная плата – асноўная крыніца даходу сям’і. Патрэбы членаў сям’і і магчымасці іх задавальнення зыходзячы з даходаў сям’і. Іншыя даходы сям’і (пенсія, стыпендыя, дапамогі і іншыя крыніцы даходу сям’і).

Выдаткі сям’і (на харчаванне, адзенне і абутак, аплату камунальных паслуг, транспартныя выдаткі і іншыя выдаткі).

Бюджэт сям’і – табліца даходаў і выдаткаў на адзін перыяд часу. Планаванне, улік і размеркаванне бюджэту сям’і. Зберажэнні як спосаб назапасіць неабходную грашовую суму.

Спажывецкі кошык. Пражытачны мінімум. Базавая велічыня. Дапамога дзяржавы малазабяспечаным і іншым катэгорыям грамадзян.

Тэма 6.3 Эканоміка і эканомія (2 г.)

Эканомія ў сям’і і яе неабходнасць. Праблема выбару ў сям’і паміж жаданым і магчымым. Эканомія матэрыяльных каштоўнасцяў, грашовых сродкаў і часу. Уплыў шкодных звычак на сямейны бюджэт.

Эканомнасць, беражлівасць і ашчаднасць. Эканомны чалавек – ашчадны, разважлівы, гаспадарлівы. Марнатраўства і скупасць.

Атрыманне дадатковых даходаў шляхам умелага вядзення хатняй гаспадаркі.

Асноўныя паняцці: сям’я, хатняя праца, даходы, выдаткі, бюджэт, спажывецкі кошык, пражытачны мінімум, базавая велічыня; эканомія, эканомнасць, ашчаднасць, беражлівасць, гаспадарлівасць; марнатраўства, скупасць.

Раздзел 7. Эканоміка школы (2 г.)

Тэма 7.1 Колькі каштуе навучанне (1 г.)

Школа – задавальненне патрэбы ў адукацыі для кожнага чалавека. Прафесіі людзей, звязаныя з працай школы. Школьная гаспадарка як частка эканомікі раёна ці горада.

Эканамічныя патрэбы школы. Бюджэт школы – выдаткі на ўтрыманне школы і даходы школы.

Тэма 7.2 Эканамічная дзейнасць вучняў (1 г.)

Эканамічная дзейнасць вучняў у вучэбны і пазавучэбны час. Гаспадарлівасць і беражлівасць – гэта эканомія школьнага бюджэту.

Асноўныя паняцці: эканоміка школы; бюджэт школы; беражлівасць, гаспадарлівасць.

Паўтарэнне учебнага матэрыялу за год (1 г.)

## ЧАКАЕМЫЯ ВЫНІКІ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

Вучні маюць уяўленні аб:

паняццях «эканоміка», «эканамічная дзейнасць чалавека», «эканомія», «эканомнасць»;

патрэбах чалавека;

спосабах задавальнення патрэб;

відах прыродных і эканамічных даброт;

адрозненні неабмежаваных і абмежаваных рэсурсаў;

прыродных багаццях і рэсурсах Беларусі;

неабходнасці рабіць выбар пры абмежаванасці рэсурсаў;

паняццях «тавар», «паслуга», «вытворчасць»;

паняццях «праца як асноўная крыніца задавальнення патрэб чалавека», «працоўныя рэсурсы»;

відах працы, у тым ліку хатняй;

галоўных вытворчых аб’ектах горада, вобласці, рэспублікі і выніках іх вытворчасці;

прафесіях людзей свайго рэгіёна (горада, пасёлка, вёскі і гэтак далей) і выніках іх працы;

узаемазалежнасці людзей розных прафесій;

прафесійных, асобасных, эканамічных якасцях чалавека, які працуе;

паняццях «бартар», «грошы»;

відах грошай і іх функцыях;

грашовай адзінцы Рэспублікі Беларусь і іншых краін;

банку і асноўных паслугах банка;

адрознення ўкладу ад крэдыту;

прызначэнні банкаўскай плацежнай карткі, банкамата і інфакіёска;

відах тавараў і паслуг, іх прыкметах;

паняцці «гандаль», відах і месцах гандлю;

паняцці «цана» і відах цэн;

кошце прадуктаў харчавання, адзення, жылля, прадметаў хатняга ўжытку;

паняцці «бюджэт сям’і» і яго складнікаў;

асноўных правілах эканоміі бюджэту сям’і;

сацыяльнай арыентаванасці палітыкі дзяржавы;

дапамозе дзяржавы некаторым катэгорыям грамадзян (малазабяспечаным і іншым);

магчымасці атрымання сацыяльнай дапамогі, парадку звароту.

Вучні ўмеюць:

прыводзіць прыклады разумных і неразумных (шкодных) патрэбаў;

рабіць неабходны выбар, заснаваны на эканамічным абгрунтаванні (набыццё тавараў, размеркаванне грошай і гэтак далей);

адрозніваць і называць асобасныя якасці чалавека (станоўчыя і адмоўныя);

адрозніваць неабходныя, пажаданыя і неабавязковыя, лішнія прадметы хатняга ўжытку, адзення і абутку;

вызначаць змест асобных відаў хатняй працы, ацэньваць выніковасць сумеснай працы з дарослымі;

вызначацца ў канкрэтных сітуацыях, звязаных з падзелам хатняй працы, улічваць свае магчымасці пры выкананні канкрэтнага віду работ;

адрозніваць грашовыя адзінкі рознай вартасці, выконваць іх размен;

праводзіць наяўныя і безнаяўныя разлікі, карыстацца банкаўскімі плацежнымі карткамі, банкаматам і інфакіёскам у простых сітуацыях;

адрозніваць тавары працяглага і кароткатэрміновага карыстання;

арыентавацца ў коштах на тавары і прадукты з улікам сезону, зніжак і гэтак далей, рабіць выгадны выбар;

вызначаць тэрмін прыдатнасці тавару, дадзеныя пра яго па этыкетцы;

планаваць грашовыя выдаткі на дзень, тыдзень;

весці запісы грашовых расходаў у кнізе ўліку;

берагчы сваю, сямейную і школьную маёмасць.

XII КЛАС (35 г.)

Раздзел 1. Чалавек у эканоміцы (2 г.). Паўтарэнне

Тэма 1.1 Узаемасувязь патрэбаў, рэсурсаў і выбару (1 г.)

Забеспячэнне патрэб чалавека ў адпаведнасці з наяўнасцю рэсурсаў і магчымасцяў. Выбар спосабаў разумнага расходавання рэсурсаў.

Тэма 1.2. Чалавек у эканоміцы – вытворца тавараў і паслуг і іх спажывец (1 г.)

Задачы эканомікі. Эканамічная дзейнасць чалавека – мэтанакіраваная і карысная дзейнасць. Чалавек – вытворца тавараў і паслуг і іх спажывец. Вынік працы чалавека – стварэнне карысных тавараў, прадметаў, паслуг.

Асноўныя паняцці: эканоміка, эканамічная дзейнасць; патрэбы, рэсурсы, выбар; вытворца, спажыванне, спажывец.

Раздзел 2. Свабодны рынак. Вытворчасць (4 г.)

Тэма 2.1 Свабодны рынак (2 г.)

Што такое свабодны рынак? Узаемаабумоўленасць попыту і прапановы. Што ўплывае на попыт? Чым вызначаецца прапанова? Утварэнне цэнаў.

Узаемасувязь эканамічных працэсаў: вытворчасці, размеркавання, абмену і спажывання тавараў і паслуг. Узаемадзеянне паміж тымі, хто стварае тавары і паслугі, і тымі, хто іх спажывае.

Тэма 2.2 Вытворчасць як аснова дабрабыту грамадства (2 г.)

Падзел працы і спецыялізацыя ў вытворчасці тавараў і паслуг. Структура сучаснай гаспадаркі (эканомікі): сфера вытворчасці і сфера паслуг.

Эканоміка рэспублікі, вобласці, твайго рэгіёна (горада, пасёлка і гэтак далей). Умовы эканамічнага росту. Багацце краіны – вытворчасць тавараў, пашырэнне магчымасцей атрымання паслуг для забеспячэння жыцця людзей.

Роля прадпрымальніцтва ў паляпшэнні эканомікі дзяржавы. Рамесніцкая дзейнасць. Падтрымка дзяржавы.

Асноўныя паняцці: свабодны рынак, попыт, прапанова; сфера вытворчасці, сфера паслуг; вытворчасць, размеркаванне, абмен, спажыванне; прадпрымальнік, малы бізнес, эканамічны рост.

Раздзел 3. Уласнасць. Падаткі (4 г.)

Тэма 3.1 Формы ўласнасці ў сучаснай эканоміцы (2 г.)

Уласнасць як крыніца багацця. Дзяржаўная і прыватная (асабістая) уласнасць. Школьная маёмасць – дзяржаўная ўласнасць.

Як можна атрымаць што-небудзь ва ўласнасць. Прыватызацыя – працэс пераўтварэння дзяржаўнай уласнасці ў прыватную ўласнасць.

Тэма 3.2 Дзяржаўны бюджэт. Падаткі (2 г.)

Падаткі – абавязковыя зборы, устаноўленыя дзяржавай. Падаткі – асноўный крыніца даходаў дзяржавы. На якія даходы ўстанаўліваюцца падаткі? Абавязковасць выплаты падаткаў і адказнасць за нявыплату.

Галоўныя артыкулы выдаткаў дзяржавы. Сацыяльная арыентаванасць эканомікі Беларусі.

Асноўныя паняцці: уласнасць, прыватная (асабістая), дзяржаўная, прыватызацыя, падатак, сацыяльна арыентаваная эканоміка.

Раздзел 4. Праца і працоўная дзейнасць чалавека (8 г.)

Тэма 4.1 Праца як умова існавання сям'і і дзяржавы (2 г.)

Працоўныя рэсурсы. Іх колькасць і якасць. Працаздольны чалавек і чалавек з інваліднасцю. Беспрацоўны чалавек. Пенсіянеры і іншыя катэгорыі насельніцтва.

Віды працоўнай дзейнасці. Працоўны сельскагаспадарчага і прамысловага прадпрыемства, будаўніцтва. Служачы. Стаўленне да працы: прафесійнае і эканамічнае, асобасныя якасці чалавека працы.

Працоўныя рэсурсы раёна, горада, вобласці, рэспублікі. Прадукты іх працоўнай дзейнасці.

Тэма 4.2 Умовы і ахова працы. Прафсаюзы (4 г.)

Працоўны дагавор (кантракт) паміж работнікам і кіраўніцтвам (адміністрацыяй) прадпрыемства. Інтарэсы работніка і інтарэсы адміністрацыі. Правы і абавязкі работніка.

Умовы працы. Шкодныя і небяспечныя для здароўя ўмовы працы. Льготы ў сувязі з асаблівымі ўмовамі працы. Працоўны стаж. Тэрміны выхаду на пенсію па ўзросце і іншыя ўмовы.

Ахова працы. Працоўны час. Працягласць працоўнага часу дарослага і падлетка. Якасць працоўнага часу і культура працы. Рацыянальны рэжым працы і адпачынку. Уплыў аховы працы на прадукцыйнасць. Наступствы невыканання аховы працы. Вытворчы траўматызм, яго прычыны, папярэджанне.

Віды адпачынкаў. Вольны ад асноўнай працы час і яго выкарыстанне. Невытворчыя эканамічныя аб'екты. Іх прызначэнне і выкарыстанне ў жыцці чалавека.

Прафсаюзы. Калектыўная дамова. Адстойванне сваіх інтарэсаў як работніка ў арганізацыі.

Этыка дзелавых узаемаадносін. Асноўныя правілы дзелавога этыкету.

Тэма 4.3 Заработная плата і яе складнікі (2 г.)

Заработная плата – гэта ўзнагароджанне за працу, асноўная крыніца даходу сям'і. Адрозненне ў аплаце працы, ад чаго яна залежыць. Віды заработнай платы і іх адрозненне. Бюджэт мінімальнага пражытачнага ўзроўню і мінімальная заработная плата.

З чаго складаецца заработная плата (аплата за адпрацаваны час, прэміі, матэрыяльная дапамога, дадатковыя сацыяльныя выплаты). Аванс. Прэмія. Што ўплывае на павелічэнне заработнай платы.

Асноўныя вылікі з заработнай платы. Пералічэнне ў пенсійны і прафсаюзны фонды. Абгрунтаванне вылікаў у пенсійны фонд. Падаходны падатак.

Асноўныя паняцці: праца і працоўная дзейнасць; праца і работа; працоўныя рэсурсы; працаздольны чалавек, чалавек з інваліднасцю, беспрацоўны чалавек, пенсіянер, рабочы, служачы; умовы працы, працоўны дагавор, працоўны стаж; ахова працы, працоўны час, вытворчы траўматызм; прафсаюзы, калектыўная дамова, заработная плата, віды заработнай платы, артыкулы грашовых даходаў, аванс, прэмія; мінімальная заработная плата, пенсійны фонд, падаходны падатак.

Раздзел 5. Грошы. Каштоўныя паперы (6 г.)

Тэма 5.1 Грошы (2 г.). Паўтарэнне

Функцыі грошай. Грошы як мера кошту, сродак звароту, сродак назапашвання, сродак плацяжу і іншыя функцыі. Грошы наяўныя і безнаяўныя. Нацыянальная і замежная валюта. Сусветныя грошы.

Патрэбы людзей у грашах. Захоўванне грошай. Размен і замена. Абмен валюты. Эканомія грашовых сродкаў. Выбар спосабу зберажэння грошай. Вядзенне ўліку даходаў і выдаткаў.

Тэма 5.2 Банк. Фінансавыя паслугі (3 г.)

Асноўныя віды фінансавых паслуг: адкрыццё банкаўскага рахунка, уклада (дэпазіта), прадастаўленне грашовага крэдыту. Безнаяўныя разлікі. Сайты банкаў і мабільныя дадаткі.

Грашовы ўклад і даход па ўкладзе. Віды ўкладаў. Выгады ад выкарыстання банкаў для захоўвання зберажэнняў.

Крэдыты. Віды крэдытаў. Крэдытныя карты. Адказнасць бакоў пры ўступленні ва ўзаемадзеянне, звязанае з грашовымі аперацыямі. Рызыкі.

Тэма 5.3 Каштоўныя паперы (1 г.)

Аблігацыя, сертыфікат – каштоўныя паперы. Чаму каштоўныя паперы патрэбны і чалавеку, і дзяржаве?

Асноўныя паняцці: грошы, наяўныя і безнаяўныя грошы, зварот грошай, нацыянальная валюта, замежная валюта, валютны курс; банк, уклад (дэпазіт), крэдыт, укладальнік, пазычальнік, бягучы банкаўскі рахунак, банкаўская плацежная картка; аблігацыя, сертыфікат; эканомія.

Раздзел 6. Гандаль. Чалавек як спажывец (6 г.)

Тэма 6.1 Тавары і паслугі (2 г.)

Прыкметы, якія характарызуюць якасць тавару або паслугі. Віды тавараў. Інфармацыя аб тавары (паўтарэнне).

Харчовыя і нехарчовыя тавары.

Рацыянальнасць спажывецкіх паводзінаў пакупніка. Правы спажыўца. Тэрмін прыдатнасці тавару. Гарантыйны тэрмін. Тэрмін абмену няякаснага тавару.

Тэма 6.2 Гандаль (4 г.)

Гандаль – абмен таварамі на аснове ўзаемнай выгады прадаўца і пакупніка. Віды рознічнага гандлю. Месцы гандлю (паўтарэнне).

Купля тавараў за наяўныя і безнаяўныя грошы. Дысконтная карта. Міжнародны гандаль. Экспарт і імпарт тавараў. Інтэрнэт-крамы.

Купля тавараў працяглага карыстання ў крэдыт і растэрміноўку. Прадастаўленне тавараў напракат.

Рэклама. Навошта і каму патрэбна рэклама. Віды гандлёвай рэкламы і месцы яе размяшчэння. Як рэклама ўплывае на рашэнне аб куплі. Як правільна выкарыстоўваць інфармацыю рэкламы. Паводзіны пакупніка.

Асноўныя паняцці: гандаль, пакупнік, прадавец, віды тавараў, якасць тавару, этыкетка, гарантыйны тэрмін, віды гандлю, цана, рэклама, экспарт, імпарт, інтэрнэт-крама.

Раздзел 7. Эканоміка хатняй гаспадаркі (4 г.)

Тэма 7.1 Бюджэт сям'і (2 г.)

Сямейны бюджэт. Праца людзей як асноўная крыніца даходаў сям'і. Сукупны месячны даход сям'і. Планаванне, улік і размеркаванне бюджэту сям'і. Задавальненне патрэб членаў сям'і зыходзячы з даходаў сям'і. Эканомія грашовых сродкаў (паўтарэнне).

Эканомнае вядзенне хатняй гаспадаркі як умова памяншэння выдаткаў. Паказанні прыбораў уліку рэсурсаў, разлік аплаты і рэгуляванне выкарыстання рэсурсаў. Разліковадаведачны цэнтр – установа комплекснага абслугоўвання насельніцтва. Размеркаванне невялікіх даходаў. Выдаткі, якіх можна пазбегнуць. Эканомны падыход у спажыванні прадуктаў харчавання. Рацыянальны падбор прадуктаў харчавання ў межах пэўнай сумы грошай для забеспячэння харчавання сям'і на працягу дня, тыдня.

Зберажэнні як вынік эканомнага размеркавання бюджэту. Багацце і стаўленне да яго.

Тэма 7.2. Уласнасць сям'і. Страхаванне (2 г.)

Асабістая і сямейная ўласнасць. Паняцці «маё», «наша», «чужое». Уласнасць як крыніца багацця. Натарыяльныя паслугі.

Арэнда – перадача ўласнасці ў часовае карыстанне за пэўную плату. Арандатар і арэндадаўца.

Страхаванне як спосаб абароны маёмасці і здароўя членаў сям'і. Абавязковае і добраахвотнае страхаванне.

Асноўныя паняцці: сямейны бюджэт, зберажэнні; даходы, выдаткі, багацце, беднасць; уласнасць, асабістая ўласнасць, сямейная ўласнасць, «маё», «наша», «чужое»; арэнда, паслугі, натарыяльныя паслугі; страхаванне.

Паўтарэнне вучэбнага матэрыялу (1 г.)

Роля эканомікі ў жыцці кожнага сучаснага чалавека.

## ЧАКАЕМЫЯ ВЫНІКІ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

Вучні маюць уяўленне аб:

асноўных задачах эканомікі;

галоўных патрэбах чалавека;

спосабах разумнага расходавання рэсурсаў (грошай, часу, прадуктаў эканомікі);

структуры сучаснай эканомікі: сфера вытворчасці; сфера паслуг;

узаемасувязі попыту і прапановы;

узаемасувязі эканамічных працэсаў: вытворчасць, размеркаванне, абмен, спажыванне;

асноўных аб'ектах эканомікі рэспублікі (свайго рэгіёну);

паняцці «працоўныя рэсурс»;

відах працы і працоўнай дзейнасці;

працоўным дагаворы, умовах працы, працоўным стажы, відах адпачынкаў;

правах і абавязках работніка;

якасцях, якія характарызуюць эканомнага працоўнага чалавека;

паняццях «прафсаюзы» і «калектыўная дамова»;

элементах дзелавога этыкету;

паняцці «заработная плата работніка» і яе складніках;

паняццях «падаходны падатак» і «пенсійны фонд»;

відах грошай і іх функцыях;

асноўных паслугах, якія прадастаўляе банк;

выгадзе захоўвання зберажэнняў на ўкладзе і рызыках крэдыту;

паняцці «каштоўныя паперы» (сертыфікат і аблігацыя);

паняцці «бюджэт сям'і»;

асноўных крыніцах даходаў і напрамкаў выдаткаў бюджэту;

спосабах эканоміі бюджэту сям'і;

паняццях «спажывецкі кошык» і «мінімальная заработная плата»;

асновах сацыяльнай арыентаванасці эканомікі дзяржавы;

асноўных відах тавараў і месцах гандлю;

пакупцы тавару ў крэдыт і растэрміноўку;

асноўных правах чалавека як спажыўца;

паняццях «свабодны рынак» і «рынкавыя адносіны»;

паняццях «уласнасць асабістая», «уласнасць сямейная» і «ўласнасць грамадская»;

паслугах натарыуса;

паняцці «арэнда»;

паняцці «страхаванне і віды страхавання».

Вучні ўмеюць:

сувымяраць свае патрэбы з рэсурсамі і магчымасцямі;

прыводзіць прыклады структуры эканомікі свайго рэгіёна: сферы вытворчасці і сферы паслуг;

адрозніваць змест паняццяў «праца», «працоўныя рэсурсы», «працоўная дзейнасць», «прадукты працы»;

адрозніваць працоўны і вольны ад працы час;

тлумачыць змест разліковага ліста заработной платы за месяц;
размяркоўваць уласныя грашовыя сродкі;
тлумачыць змест чэка пры пакупцы тавару;
удзельнічаць у планаванні і размеркаванні сямейнага бюджэту;
здымаць паказанні лічыльнікаў і выкарыстоўваць іх пры аплаце камунальных паслуг;
рэгуляваць выкарыстанне рэсурсаў у адпаведнасці з паказаннямі лічыльнікаў;
вызначаць набор прадуктаў харчавання ў межах пэўнай сумы для харчавання на дзень;
вызначаць спосабы эканоміі грашовых сродкаў і эканомна расходаваць асабістыя зберажэнні;
ацэньваць уласныя эканамічныя дзеянні ў якасці члена сям'і, спажыўца;
вызначаць тэрмін прыдатнасці тавару;
вызначаць якасць тавараў па шэрагу прыкмет;
мадэляваць спажывецкія паводзіны ў працэсе куплі тавараў;
выконваць размен, замену грошай;
вырашаць практычныя задачы, якія адлюстроўваюць тыповыя эканамічныя сітуацыі;
ужываць інфармацыйна-камунікацыйныя камп'ютарныя тэхналогіі для вырашэння практычных задач;
адрозніваць паняцці «уласнасць сям'і», «асабістая ўласнасць», «грамадская ўласнасць»;
прымяняць атрыманыя веды для вызначэння эканамічна рацыянальных паводзінаў і парадку дзеянняў у канкрэтных сітуацыях.

Прыкладны пералік тэм і практыкаванняў

| № п/п | Назва раздзела / тэмы | Практыкаванні |
|---|---|---|
| XI клас | | |
| Уводзіны. ЭКАНОМІКА | | |
| 1 | Што такое эканоміка? | «Што мне дае эканоміка» |
| Раздзел 1. ПАТРЭБЫ. РЭСУРСЫ. ВЫБАР | | |
| 1.1 | Патрэбы | 1. «Ацэньваем свае патрэбы, інтарэсы і жаданні. Вызначаем разумныя і неразумныя»<br>2. «Складаем праграму здаровага ладу жыцця»<br>3. «Адпрацоўваем правілы бяспечных паводзінаў у школе, на вуліцы, на дарозе, у транспарце»<br>4. «Як звярнуцца да чалавека ў незнаёмай абстаноўцы»<br>5. «Вучымся кантраляваць свае ўчынкі і жаданні» |
| 1.2 | Рэсурсы | «Выкарыстоўваем парады па зберажэнню прыродных рэсурсаў» |
| 1.3 | Абмежаванасць магчымасцяў і рэсурсаў. Выбар | «Вучымся суадносіць свае магчымасці і рабіць выбар» |
| Раздзел 2. ЭКАНОМІКА І ВЫТВОРЧАСЦЬ | | |
| 2.1 | Развіццё эканамічных адносін | Акцыя «Выратуй дрэва – здай макулатуру!» |
| 2.2 | Вытворчасць – аснова эканомікі | Экскурсія на мясцовую вытворчасць |
| Раздзел 3. ПРАЦА І ПРАФЕСІЯ | | |
| 3.1 | Праца як умова існавання людзей | 1. «Складаем правілы працавітага вучня»<br>2. «Плануем сваю працу на вучэбны дзень»<br>3. «Знаем, ганарымся і выбіраем тое, што выраблена ў Беларусі» |
| 3.2 | Прафесія | «Як выбраць прафесію? Вывучаем даведнік для паступаючых» |
| Раздзел 4. ГРОШЫ | | |
| 4.1 | Грашовая адзінка Беларусі | 1. «Ведаем і адрозніваем свае грошы»<br>2. «Робім абмен грошай (валюты)» |
| 4.2 | Банк. Грашовыя разлікі | 1. «Адкрываем бягучы рахунак у банку»<br>2. «Як зберагчы свае грошы?»<br>3. Рашэнне эканамічных задач<br>4. «Вучымся карыстацца пластыкавай карткай»<br>5. «Асноўныя правілы бяспекі выкарыстання банкаўскай плацежнай карткі» |

| | | |
|---|---|---|
| Раздзел 5. ТАВАР. ПАСЛУГІ. ГАНДАЛЬ. ЦАНА | | |
| 5.1 | Тавары і паслугі | 1. «Чытаем этыкетку тавару»<br>2. «Вызначаем тэрміны выкарыстання прадуктаў»<br>3. «Выбіраем тавары па іх уласцівасцях»<br>4. «Вызначаем з дапамогай умоўных абазначэнняў правільныя дзеянні па догляду за адзеннем» |
| 5.2 | Гандаль. Цана | 1. «Складаем спіс пакупак оптам і ў розніцу. Разлічваем іх кошт»<br>2. «Выбіраем лепшую цану тавару, выкарыстоўваем рэкламныя буклеты»<br>3. «Выбіраем тавар і паслугу ў адпаведнасці з коштам і якасцю тавару» |
| Раздзел 6. ЭКАНОМІКА ХАТНЯЙ ГАСПАДАРКІ | | |
| 6.1 | Бюджэт сям'і | 1. «Плануем і разлічваем бюджэт сям'і»<br>2. Рашэнне эканамічных задач<br>3. «Вядзем гаспадарчую кнігу. Улік даходаў і выдаткаў»<br>4. «Звяртаемся па дапамогу ў цяжкай жыццёвай сітуацыі»<br>5. «Экскурсія ў ТЦСАН» |
| 6.2 | Экономіка і эканомія | 1. «Вызначаем спосабы эканоміі ў сям'і»<br>2. «Складаем правілы эканомнага гаспадара» |
| Раздзел 7. ЭКАНОМІКА ШКОЛЫ | | |
| 7.1 | Колькі каштуе навучанне | 1. «Хто плаціць за бясплатныя даброты? Разлік вартасці навучання ў школе»<br>2. Рашэнне эканамічных задач |
| 7.2 | Эканамічная дзейнасць вучняў | «Складаем план дапамогі школьнай эканоміцы» |
| XII клас | | |
| Раздзел 1. ЧАЛАВЕК У ЭКАНОМІЦЫ. ПАЎТАРЭННЕ | | |
| 1.1 | Узаемасувязь патрэб, рэсурсаў і выбару | 1. «Выбіраем спосабы разумнага расходавання рэсурсаў»<br>2. «Суадносім абмежаванасць рэсурсаў і свае патрэбы. Робім выбар» |
| 1.2 | Чалавек у эканоміцы – вытворца тавараў і паслуг і іх спажывец | «Вынікі працы чалавека – стварэнне карысных тавараў, прадметаў, паслуг» |
| Раздзел 2. СВАБОДНЫ РЫНАК. ВЫТВОРЧАСЦЬ | | |
| 2.1 | Свабодны рынак | Эканамічная гульня «Рынак» |
| 2.2 | Вытворчасць як аснова дабрабыту грамадства | 1. «Экскурсія на прадпрыемствы горада (раёна)»<br>2. Эканамічная гульня «Рамеснік» |
| Раздзел 3. УЛАСНАСЦЬ. ПАДАТКІ | | |
| 3.1 | Формы ўласнасці ў сучаснай эканоміцы | «Афармляем сваю маёмасць ва ўласнасць» |
| 3.2 | Дзяржаўны бюджэт. Падаткі | «Аплачваем падаткі» |
| Раздзел 4. ПРАЦА І ПРАЦОЎНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ ЧАЛАВЕКА | | |
| 4.1 | Праца як умова існавання сям'і і дзяржавы | «Праца – асноўная крыніца жыццезабеспячэння чалавека» |
| 4.2 | Умовы і ахова працы. Прафсаюзы | 1. Вывучаем «Працоўны дагавор (кантракт)». Знаёмімся з правамі і абавязкамі работніка<br>2. Вывучаем «Ахова працы»<br>3. «Плануем рацыянальнае размеркаванне часу на працу і адпачынак»<br>4. Вывучаем «Калектыўную дамову. Інтарэсы работніка і прадпрыемства»<br>5. «Вучымся выконваць дзелавы этыкет» |
| 4.3 | Заработная плата і яе складнікі | Рашэнне эканамічных задач |
| Раздзел 5. ГРОШЫ. КАШТОЎНЫЯ ПАПЕРЫ | | |
| 5.1 | Грошы. Паўтарэнне | 1. «Размяркоўваем грошы на задавальненне патрэб і зберажэнне»<br>2. Рашэнне эканамічных задач |
| 5.2 | Банк. Фінансавыя паслугі | 1. «Выконваем безнаяўныя разлікі»<br>2. «Выбіраем від укладу ў адпаведнасці з умовамі»<br>3. «Вучымся карыстацца мабільнымі дадаткамі» |
| Раздзел 6. ГАНДАЛЬ. ЧАЛАВЕК ЯК СПАЖЫВЕЦ | | |
| 6.1 | Тавары і паслугі | 1. «Выбіраем тавар у адпаведнасці з цаной і якасцю шляхам параўнання коштаў»<br>2. «Чытаем змест чэка»<br>3. «Вывучаем правы спажыўца на канкрэтных прыкладах»<br>4. «Вучымся карыстацца рэкламай тавару (паслугі). Выпрацоўваем правільныя паводзіны пакупніка» |

| | | |
|---|---|---|
| Раздзел 7. ЭКАНОМІКА ХАТНЯЙ ГАСПАДАРКІ | | |
| 7.1 | Бюджэт сям'і | 1. «Правілы эканоміі грашовых сродкаў сям'і»<br>2. «Вучымся рэгуляваць выдаткі на камунальныя паслугі»<br>3. Рашэнне эканамічных задач |
| 7.2 | Уласнасць сям'і. Страхаванне | 1. «Страхуем сваю маёмасць»<br>2. «Атрымліваем паслугі натарыуса»<br>3. «Здаём кватэру ў арэнду (арандуем кватэру)» |